Офіс за Дэмакратычную Беларусь

# Навіны для Беларусі

Нумар XI

1 лютага 2008 года

*Office for a Democratic Belarus*

***Наступствы аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі чалавецтва адчувае і сёння...***

***У нумары***

| | |
|---|---|
| *Беларусь да і пасля аварыі на ЧАЭС (працяг)* | 1-3 |
| *Еўразвяз і Беларусь (заявы)* | 4-5 |
| *Пургурыдэс і Рыгані: два падыходы да Беларусі ў ПАРЕ* | 5-7 |
| *У ЕЗ збіраюць подпісы за зніжэнне кошту віз для беларусаў* | 7 |
| *Абвестка* | 7 |

Мы ў сеціве

www.democraticbelarus.eu

## Беларусь да і пасля Чарнобыля: « Радыеэкалогія: дэмаграфічныя і медыцынскія аспекты» (II)

*Урыўкі з працы прафесара Ю.І. Бандажэўскага*

**Працяг матэрыялу, надрукаванага ў нумары за 11 снежня 2007 г.**

Стан здароўя дзяцей у Беларусі ў пост-чарнобыльскі перыяд пастаянна пагаршаецца. Захворваемасць вырасла практычна па ўсіх класах хвароб. Трэба адзначыць, што калі за перыяд з 1988 па 1996 гг. першасная захворваемасць па рэспубліцы вырасла на 30,2%, дык у Гомельскай вобласці гэта лічба склала 101,8 % [41]. Асабліва відавочны рост паталогій эндакрыннай сістэмы, органаў страваванння, нервовай сістэмы, інфекцыйных і паразітарных хвароб. Вырасла колькасць захворванняў на злаякасныя ўтварэнні, сярод якіх дамінуе рак шчытападобнай залозы [41].

Звяртае на сябе ўвагу павелічэнне выпадкаў цукровага дыябету сярод дзяцей Гомельскай вобласці (у перыяд з 1985 па 1993 гг. часціня гэтага захворвання ўзрасла з 3,46 да 13,15 на 100.000 дзяцей), а таксама эндэмічнага зобу (у перыяд з 1985 па 1993 г. выпадкі захворвання павялічыліся з 1,84 да110,2 на 100.000 дзяцей).

Асаблівую ўвагу хацелася б надаць стану сардэчна-сасудзістай сістэмы ў малых.



У дзіцячым узросце практычна не рэгіструюцца характэрныя для дарослага арганізму формы сардэчна-сасудзістыя паталогіі, такой як, напрыклад, ішэмічная хвароба сэрца. Аднак у дзяцей, якія жывуць на тэрыторыі, забруджанай радыенуклідам Cs-137, адзначаецца высокая часціня парушэнняў рытму сардэчных скарачэнняў. Выяўлена непасрэдная залежнасць паміж гэтым паказальнікам і колькасцю Cs-137 у арганізме [9].

У дзяцей, якія жывуць у вёсцы Свяцілавічы, на адлегласці 30 км. ад Гомеля (узровень забруджвання глебы Cs-137 складаў 15-40 Кю/км2) сярэдні узровень Cs-137 у арганізме дасягаў у 1996 г. 91,20+7,68 Бк/кг, і ў 94,4% выпадкаў былі зарэгістраваныя электракардыяграфічныя змяненні [6].

На наш погляд, гэта "схаваная" паталогія з'яўляецца асновай для фармавання цяжкіх паталагічных працэсаў у больш сталым узросце.

Такім чынам, можна канстатаваць няўхільнае пагаршэнне стану здароўя беларускага насельніцтва, пачынаючы з 1970-х гг., што супадае з перыядам шырокага распаўсюджання радыеактыўных агентаў у біясферы, найперш Cs-137. Аднак наяўнасць прычынна-выніковай сувязі паміж гэтымі дзвюма з'явамі афіцыйнай медыцынскай навукай СССР не прызнавалася. Рабілася выснова пра тое, што назапашванні Cs-137 і Sr-90 у асноўных прадуктах харчавання такія, што з пранікненнем у арганізм чалавека не здольныя выклікаць істотныя саматычныя змяненні [22].

Становішча з прызнаннем ролі Cs-137 у індукцыі паталагічных працэсаў у арганізме чалавека не змянілася і пасля Чарнобыльскай катастрофы. Толькі вялікая колькасць захворванняў на рак шчытападобнай залозы вымусіла афіцыйныя медыцынскія міжнародныя колы (у прыватнасці Усясветную арганізацыю аховы здароўя) прызнаць сувязь паміж інкарпарацыяй Cs-137 у арганізм чалавека і

і далейшым узнікненнем паталагічных працэсаў і захворванняў. Толькі дзейнасць Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута з моманту свайго адкрыцця ў 1990 г. і да майго нечаканага арышту ў 1999 г. вылучалася сваімі навуковымі даследаваннямі і заснаванымі на іх выніках высновамі.

**Абмеркаванне гіпотэзы пра сувязь стану здароўя насельніцтва з забруджваннем арганізма радыеактыўнымі элементамі, а менавіта — Cs-137**

Даволі працяглы час у навуковых публікацыях, прысвечаных інкарпарацыі Cs-137 у арганізм чалавека і жывёлы, паказвалася на тое, што гэты радыенуклід назапашваецца пераважна мышачнай сістэмай [14]. Супрацоўнікі Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута на падставе вынікаў радыеметрычных даследаванняў, якія ажыццяўляліся ў часе аўтапсіі памёрлых жыхароў Гомельскай вобласці ў 1991-1999 гг. , зафіксавалі высокі ўзровень прысутнасці Cs-137 не толькі ў шкілетных мышцах, але і ў шчытападобнай залозе, надныркавых і падстраўнікавай залозах, у сэрцы, тонкай і тоўстай кішках, страўніку, нырках, селязёнцы, галаўным мозгу і лёгкіх. Велічыня інкарпарацыі ў іх была рознай, у залежнасці ад характару паталагічнага працэсу [5]. Было адзначана, што ўнутраныя органы дзяцей назапашваюць гэты радыенуклід больш інтэнсіўна, чым унутраныя органы дарослых [8].

Атрыманыя звесткі знаходзяць пацверджанне ў выніках эксперыментальных даследаванняў па ўвядзенні ў арганізм лабараторных жывёлін Cs-137.

Паказальна, што праз 10 дзён пасля пачатку эксперыменту па ўвядзенні ў арганізм гэтага радыенукліду ў складзе харчовых прадуктаў, найбольшая яго канцэнтрацыя была зарэгістравана ў сэрцы жывёліны і значна менш – у нырках, селязёнцы і печані [9].

І толькі пасля ўвядзення вялікіх доз Cs-137 жывёліне рэгіструецца высокая канцэнтрацыя ізатопу ў шкілетных мышцах [7].

Вынікі паталагаанатамічных даследаванняў, а таксама вынікі эксперыментаў з лабараторнымі жывёлінамі дазволілі нам знайсці сувязь паміж канцэнтрацыяй Cs-137 у арганізме і паталагічнымі зменамі, што адбываюцца ў вантробах [5].

Яны ўзгадняюцца з вынікамі шматлікіх электракардыяграфічных даследаванняў адносна здаровых дзяцей ва ўзросце 3-6 гадоў, калі намі было выяўлена прама прапарцыйная залежнасць паміж часцінёй парушэнняў сардэчнага рытму і канцэнтрацыяй цэзію ў арганізме [9,11].

Дасканальны аналіз атрыманага матэрыялу дазваляе зрабіць шэраг высноў. Перад усім гэта датычыць канцэнтрацыі Cs-137 у целе чалавека.

Невялікія канцэнтрацыі дадзенага радыенукліду (да 20 Бк/кг) выклікаюць парушэнні рэгуляторных працэсаў у арганізме, як след адбываецца паніжэнне анабалічных працэсаў ў выпадку адсутнасці аднаго з **алельных (1)** генаў.

Праявай гэтага як раз і з’яўляецца ўзнікненне парушэнняў рытму ў вонкава здаровых дзяцей. Адносна невялікая колькасць радыяцэзію з’яўляецца індуктарам фенатыповай праявы схаванай генетычнай неабароненасці. Адсутнасць актыўнасці аднаго з алельных генаў кампенсуецца інтэнсіўнай працай іншага гена, калі імунная сістэма яго стымулюе.

Cs-137 парушае гэту рэгуляторную сувязь і правакуе ўзнікненне генетычна абумоўленых паталагічных працэсаў і захворванняў. Найбольш яркім доказам гэтага пастулата ёсць індукцыя цэзіем мульціфактарыяльных прыроджаных заганаў развіцця ў зародышаў жывёл з генетычна абумоўленай схільнасцю да іх [31]. Мы пазначаем дзеянне Cs-137 як дызрэгуляторнае, якое парушае сувязь паміж імуннай сістэмай і генетычным апаратам клетак розных органаў.

Уздзеянне Cs-137 парушае сувязь паміж імуннай сістэмай і генетычным апаратам клетак розных органаў

Працяглая інкарпарацыя Cs-137 у больш высокіх дозах( звыш 50 Бк/кг масы цела) вядзе да выражаных дыстрафічных, некрабіятычных і склератычных зменяў у вантробах. У гэтым выпадку праяўляецца таксічнае дзеянне гэтага радыенукліду на арганізм.

Такая выснова пацвярджаецца вынікамі даследаванняў расійскіх вучоных [15].

Асобна трэба адзначыць пашкоджанне органаў зроку ў дзяцей, якія жывуць на тэрыторыі, забруджанай радыенуклідамі.

Намі была выяўлена залежнасць паміж часцінёй узнікнення катаракты ў дзяцей і колькасцю Cs-137 у іх арганізмах. Змяншэнне ўтрымання радыенукліду ў арганізме вядзе да знікнення ўзгаданай паталогіі [7,36].

Вельмі важным у практычным і навуковым сэнсе з’яўляецца пытанне пра тое, як Cs-137 уплывае на рэпрадуктыўныя працэсы, праходжанне цяжарнасці і ўнутрыўлоннае развіццё дзіцяці. Улічваючы атрыманыя намі навуковыя звесткі [36,37], а таксама засноўваючыся на выніках іншых даследаванняў[38,39,40,41,42], у тым ліку і медыка-генетычнага аналізу [1, 29], можна абгрунтавана сцвярджаць, што рэпрадуктыўнае здароўе жыхароў забруджаных тэрыторый пастаянна пагаршаецца. Гэта датычыць як стану жаночай і мужчынскай палавых сістэм, праходжання цяжарнасці і развіцця зародышу, так і працэсаў пасляродавага развіцця арганізму. Пранікненне цэзію ў сістэму маці-плод правакуе развіццё прыроджаных заганаў дзіцяці, калі ёсць генетычная абумоўленасць для іх узнікнення (гэтак званыя мульціфактаральныя заганы развіцця).

Шкоднае ўздзеянне Cs-137 на здароўе людзей пацвярджаюць і вынікі даследаванняў японскіх навукоўцаў, якія статыстычна давялі залежнасць паміж дозай апраменьвання і вялікай колькасцю смярцей ад неракавых захворванняў, а менавіта: сардэчна-сасудзістых захворванняў, інсультаў, захворванняў стрававальнай сістэмы [26].(Yamada et al.)

У перыяд з 1958 па 1998 даследавалася група людзей, якія атрымалі вялікія дозы апраменьвання ў часе бамбардзіровак 1945 г. [27]. Атрыманыя імі звесткі супадаюць з Wong et al., якія паказалі на прамую залежнасць паміж дозай апраменьвання і высокай захворваемасцю сярод насельніцтва, старэйшага за 40 гадоў на рак шчытападобнай залозы, хваробы печані, маткі, а таксама частыя выпадкі ўзнікнення інфаркту міякарду, катаракты, гіпертэнзіі, паразы нырак і мачавога пузыра. [28].

**Даведка “Навінаў для Беларусі”**

**Алельныя гены** (1) – розныя формы аднаго і таго ж гену, што размяшчаюцца ў аднолькавых дзялянках (локусах) гамалагічных храмасом. Гэтыя гены вызначаюць развіццё адной і той жа прыкметы. Калі нейкі з генаў па якойсьці прычыне не спрацоўвае, яго функцыі выконваюцца другім генам з пары.

**Літаратура**


1.Анализ заболеваемости населения, пострадавшего вследствие катастрофы на ЧАЭС, 1993 год. Минск, 1994. - 156с.

5.Бандажевский Ю.И. Патология инкорпорированного радиоактивного излучения. - Минск: Белорусский государственный технологический университет, 1999. - 136с.

6.Бандажевский Ю.И. Радиоцезий и сердце (патофизиологические аспекты). - Минск:"Белрад", 2001. - 62с.

7.Бандажевский Ю.И. Патологические процессы в организме при инкорпорации радионуклидов. - Минск:"Белрад", 2002. -142с.

8.Bandazhevsky Yu. I. Cs-137 incorporation in children's organs. // Swiss. Med. Weekly 133:p. 488-490, 2003.

9.Бандажевский Ю.И., Бандажевская Г.С. Влияние радиоактивных элементов, попавших в окружающую среду в результате аварии на ЧАЭС на состояние миокарда - В книге: Клинико-экспериментальные аспекты влияния инкорпорированных радионуклидов на организм/ Бандажевский Ю.И., Лелевич В.В., Стрелко В.В. и др.; Под редакцией Ю.И. Бандажевского, В.В.Лелевича. - Гомель, 1995. - С 48-73.

11.Bandajevsky Yu. I., Bandajevskaya G. Cardimyopathies au cesium 137// CARDINALE (Paris), XV : № 8, p. 40-42; Octobre 2003.

14.Журавлев В.Ф. Токсикология радиоактивных веществ. - 2-е издание, переработанное и дополненное. - Москва: Энергоатомиздат, 1990. - 336с.

15.Запольская Н.А., Федорова А.В., Лаврентьев Л.Н. и др. Сравнительная оценка токсического действия на организм некоторых радионуклидов// Радиационная гигена. Выпуск 5. Сборник научных трудов по радиационной гигиене. Под редакцией профессора П.В.Рамзаева. Ленинград, 1975, С. 146-153.

22.Содержания стронция-90 и цезия-137 в основных продуктах питания населения Белоруссии. Русяев А.П., Тернов В.И., Гурская Н.В. и др. / В сборнике: Гигиена труда и охрана здоровья населения. Минск, 1974. - С. 22-26.

26.Preston D.L.,Shimizu Y., Pierce D.A., Suyama A. and Mabuchi K. Studies of mortality of atomic bomb survivors. Report 13 : solid cancer and noncancer disease mortality: 1950-1997 // Radiat. Res. - 2003. - Vol. 160. - P. 381-407.

27.Yamada M., Wong F., Fujiwara S., Akahoshi M. and Suzuki G. Noncancer disease incidence in atomic bomb survivors : 1958-1998. // Radiat. Res. - 2004. - Vol. 161. - P. 622-632.

28.Wong F.L., Yamada M., Sasaki H. at al. Noncancer disease in the atomic bomb survivors: 1958-1986 // Radiat. Res. - 1994. - Vol. 135. - P. 418-430.

29.Лазюк Г.И., Румянцева Н.В., Политыко А.Д., Егорова Т.М. Анализ унаследованных de novo структурных перестроек хромосом как один из методов оценки воздействия радионуклидов на наследственные структуры человека / Достижения медицинской науки Беларуси. Выпуск 6. - 2001.

31.Бандажевский Ю.И. Радиоцезий и внутриутробное развитие зародыша. Мн:"Белрад". - 54с.

36.Клинико-экспериментальные аспекты влияния инкорпорированных радионуклидов на организм / Бандажевский Ю.И., Лелевич В.В..Стрелко В.В. и др.; Под редакцией Ю.И. Бандажевского, В.В Лелевича. - Гомель, 1995. - 173с.

37.Структурно-функциональные эффекты инкорпорированных в организм радионуклидов / Под редакцией Ю.И. Бандажевского. - Гомель, 1997. - 152с.

38.Мацюк Я.Р., Абакумов В.З., Троян Э.И. и др. Особенности становления структуры и функции семенников у потомства при воздействии инкорпорированных радионуклидов/ Достижения медицинской науки Беларуси. Выпуск 2. - 1997.

39.Мацюк Я.Р., Троян Э.И., Слободская Н.С., Кравчук Р.И. Становление мужской репродуктивной системы у потомства 1 и 2 поколений при воздействии инкорпорирумых с пищей радионуклидов/ Достижения медицинской науки Беларуси. Выпуск 3. - 1998.

40.Мацюк Я.Р., Гудинович С.Я., Слободская Н.С., Михальчук Е.Ч. и др. Нарушения инкорпорируемыми радионуклидами становления у потомства структурно-метаболических и репродуктивных свойств женской половой системы и их профилактика / Достижения медицинской науки Беларуси. Выпуск 6. - 2001.

41.Ломать Л.Н., Гальбурт Г.Н., Кулинкина В.В., Монастырская П.Л. Анализ заболеваемости и смертности детского населения различных регионов Беларуси/Достижения медицинской науки Беларуси. Выпуск 3. - 1998.

42.Дуда В.И., Дуда И.В., Сушко В.Я., Кулага О.К. Особенности полового созревания девочек, проживающих на территориях с повышенными уровнями радиации / Достижения медицинской

# Еўразвяз і Беларусь

## Заявы і артыкулы

## Еўразвяз заклікае беларускія ўлады да дыялогу з індывідуальнымі прадпрымальнікамі

Еўразвяз заклікае беларускія ўлады распачаць дыялог з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, паведамляе Крысціна Галах, спікер высокага прадстаўніка ЕЗ па пытаннях знешняй палітыкі і ўнутранай бяспекі Хаўера Саланы. Спадарыня Галах распавяла, што Рада ЕЗ была "расчаравана" тым, што міліцыя ўжыла сілу для разгону мітынгу прадпрымальнікаў у Мінску.

"Еўразвяз асуджае турэмныя прысуды, вынесеныя 20 дэманстрантам за ўдзел у акцы", – адзначыла сакратар сп. Саланы і дадала, што "27-мі нацыянальны Звяз лічыць кожны прысуд палітычна матываваным". Афіцыйны прадстаўнік Еўразвязу заклікала беларускія ўлады паважаць права грамадзян на мірныя сходы. Рада ЕЗ спадзяецца, што беларускія ўлады дазволяць індывідуальным прадпрымальнікам правесці запланаваную на 21 студзеня акцыю, і што яна пройдзе мірна. Еўразвяз мае намер уважліва сачыць за развіццём падзей.

14/01/2008

**Крыніца: naviny.by**

Пераклад "Офісу за дэмакратычную Беларусь"

## Заява старшыні дэлегацыі па Беларусі з нагоды арыштаў дэмакратычных актывістаў

**Страсбур, 17 студзеня 2008**

Ад імя дэлегацыі па адносінах з Беларуссю я моцна асуджаю арышт 10 актывістаў "Маладога фронту" і "Моладзі БНФ", затрыманых у часе мірнага адзначэння дня салідарнасці з палітзняволенымі і сем'ямі зніклых беларускіх дзеячаў.

Гэта смелыя маладыя людзі – Франак Вячорка, Антон Каліноўскі, Юрась Станкевіч, Уладзімір Сяргееў, Кася Краснова, Людміла Атакулава, Кася Галіцкая, Максім Вянярнскі, Павал Кур'яновіч і Вольга Кулякевіч , якія ўчора смела абаранялі сваё права на свабоду выражэння і сходаў, сёння паўсталі перад судом у Мінску. Некаторыя ўжо атрымалі па 15 сутак арышту.

Я яшчэ больш абураны двухтыднёвым прысудам лідэру АГП Анатолю Лябедзьку і 15 іншым арганізатарам мітынгу індывідуальных прадпрымальнікаў, які адбыўся 10 студзеня.

Я патрабую вызвалення ўсіх актывістаў дэмакратычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

Апошнія арышты і палітычны пераслед, а таксама знаходжанне за кратамі Аляксандра Казуліна, Артура Фінкевіча, Зміцера Дашкевіча, Андрэя Клімава і іншых палітычных вязняў цалкам пярэчаць рыторыцы беларускага кіраўніцтва пра тое, што яно жадае палепшыць стасункі з Еўразвязам.

Вызваленне ўсіх палітзняволеных з'яўляецца галоўнай умовай для ўзнаўлення адносін паміж ЕЗ і Беларуссю ў рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседства. Беларускія ўлады на чале з Лукашэнкам павінны зрабіць канкрэтныя і незваротныя крокі ў гэтым кірунку як мага хутчэй.

17/01/2008

**Крыніца: europarl.europa.eu**

Пераклад "Офісу за дэмакратычную Беларусь"



***Новы старшыня дэлегацыі па адносінах з Беларуссю ў Еўрапарламенце***

Польскі дэпутат Яцэк Пратасевіч (05.06.1967) з партыі партыі "Грамадзянская платформа" быў абраны старшынём дэлегацыі па адносінах з Беларуссю ў Еўрапарламенце бальшынёй галасоў.

Спадар Пратасевіч змяніў на гэтай пасадзе папярэдняга старшыню Богдана Кліха, які неўзабаве зрабіўся міністрам абароны Польшчы. Належыць да буйнейшай ў Еўрапейскім Парламенце фракцыі – Еўрапейскай народнай партыі.

# Дакладчык ПАРЭ: Дыялог з Беларуссю павінны быць узноўлены



“Радзе Еўропы неабходна пачаць сур’ёзна думаць пра тое, што рабіць для папулярызацыі дэмакратычных каштоўнасцей у Беларусі. Я супраць таго, каб спыняць усе кантакты з беларускімі ўладамі, як мы бачылі, гэта ніякім чынам не ўплывае на сітуацыю ў краіне, і толькі ўскладняе доступ да простых грамадзян”, – адзначыў Андрэа Рыгані, заклікаючы пачаць пакрокавы дыялог, заснаваны на палітыцы добрасуседства.

У часе абмену думкамі наконт сітуацыі ў Беларусі адмысловы дакладчык сп. Рыгані дакладна акрэсліў сваю пазіцыю:

Парламенцкая Асамблея і Рада Еўропы павінны ўзнавіць палітычны дыялог з Беларуссю – адзінай еўрапейскай краінай, якая знаходзіцца па-за Радай і чый статус назіральніка быў прыпынены ў 1997 г. у сувязі з рэферэндумам, што абмежаваў правы парламенту краіны.

“Беларусь знаходзіцца ў Еўропе і адкрытая для дыялогу. Мы хочам стабільнасці і дэмакратыі ў нашай краіне і жадаем наблізіцца да стандартаў Рады Еўропы, пра што сведчыць намер увесці мараторый на смяротнае пакаранне”, – адзначыла Наталля Андрэйчык, старшыня пастаяннай камісіі Савету Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, якая брала ўдзел у абмеркаванні. Яна таксама сказала, што Беларусь магла б зрабіць пэўны ўнёсак у працу ПАРЭ па барацьбе з карупцыяй, гандлем людзьмі, арганізацыі міжканфесійнага дыялогу і міграцыі.

Аднак старшыня партыі БНФ Вінцук Вячорка паведаміў, што сітуацыя з правамі чалавека і вяршэнствам закону ў краіне значна пагоршылася з пачатку года, што ўлады працягваюць ствараць перашкоды для дзейнасці апазіцыі, грамадскіх арганізацый і незалежных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама змяшчаюць людзей за краты па палітычных матывах.

23/01/2008

**Крыніца:** coe.int

Пераклад: “Офіс за дэмакратычную Беларусь”

# ПАРЭ: Пургурыдэс і Рыгані – два падыходы да Беларусі

*Вольга Стужынская*

*28 студзеня, 2008*

Актыўнае абмеркаванне беларускага пытання прыпынілася ў Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЭ) ў 2004 г., пасля агучвання добра вядомага даклада Хрыстаса Пургурыдэса **[1]**і прыняцця следам за гэтым рэзалюцыі па зніклых асобах **[2]**, гэтак сама як і рэзалюцыі па пераследаванні друку ў Беларусі **[3]**. На працягу 2004-2005 гг. ПАРЭ працягвала рабіць заявы, якія асуджалі складаную сітуацыю з правамі чалавека, палітычнымі свабодамі і незалежнымі медыямі ў краіне і заклікала беларускія ўлады палепшыць сітуацыю праз вызваленне палітычных вязняў, правядзенне свабодных і справядлівых выбараў, стварэнне належных ўмоў для існавання незалежных СМІ і дазвол на свабоду асацыяцый.

Даклад Хрыстаса Пургурыдэса пра знікненне вядомых грамадскіх дзеячаў у Беларусі і мяркуемую ўцягнутасць у гэта злачынства прадстаўнікоў улады, яго перакананая пазіцыя ў неабходнасці адмовы ад ўсялякіх стасункаў з афіцыйным Мінскам да правядзення поўнага расследавання выпадкаў знікнення людзей і паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека, прывялі да ўсталявання так званай *лініі Пургурыдэса* ў ПАРЭ.

Старшыня Асамблеі Рэнэ ван дер Ліндэн быў першым, хто прапанаваў больш інтэнсіўнае супрацоўніцтва з беларускім кіраўніцтвам. Ён агучыў сваю прапанову ў лютым 2006 г. на канферэнцыі ў Празе: “Мы павінны скончыць ізаляцыю беларускага народа. Мы мусім умацоўваць непасрэдныя кантакты з дэмакратычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю краіны. Мы павінны ўзмацніць сваю прысутнасць у Беларусі. Асамблея прапаноўвае стварыць Інфармацыйны цэнтр Рады Еўропы ў Мінску” **[4]**. Праз некалькі месяцаў спадар Ван дэр Ліндэн павітаў некаторыя змены ў падыходзе ЕЗ да Беларусі, якія мелі на ўвазе большую адкрытасць да дыялогу з урадам: “Я перакананы, што адзіны шлях палепшыць сітуацыю – шлях перамоў” – сказаў ён **[5]**. Прыблізна ў гэты самы час пачалася падрыхтоўка да афіцыйнага візіту Ван дэр Ліндэна ў Мінск, які, падаецца, каардынаваўся не толькі з беларускім чынавенствам, але і з Крамлём **[6]**. У часе трохдзённага візіту ў студзені 2007 г. старшыня ПАРЭ заклікаў узнавіць супрацоўніцтва з Беларуссю. На яго думку, пасля расійска-беларускага газавага крызісу сітуацыя істотна змянілася, і ў беларускага боку з’явілася значна большае жаданне рухацца насустрач еўрапейскім структурам. Ён зазначыў, што яго станоўчая рэакцыя на запрашэнне беларускага парламенту і сам візіт у Беларусь прадэманстравалі гатоўнасць Рады Еўропы да дыялогу. Аднак гэты дыялог мусіць праходзіць у адпаведнасці з прынцыпамі і каштоўнасцямі ўзгаданай арганізацыі.

Заявы сп. Ван дэр Ліндэна ў Мінску (хоць і скажона пададзеныя беларускім дзяржаўным тэлебачаннем) былі яснымі. На момант яго візіту ўжо была ў большай ці меншай ступені дасягнутая агульная дамоўленасць паміж рознымі інстытутамі міжнароднай супольнасці аб тым, што неабходна наладзіць пэўны дыялог з прадстаўнікамі афіцыйнай улады, але абавязкова на умовах, сярод якіх вызваленне палітычных вязняў, павага да міжнародных выбарчых стандартаў, палітычны плюралізм і наяўнасць клімату для развіцця моцнай грамадзянскай

Што звяртае на сябе ўвагу ў пазіцыі Ван дэр Ліндэна, дык гэта яго разуменне ролі Расіі ў прасоўванні еўрапейскіх каштоўнасцей на Беларусі. Пазітыўны ўплыў "сяброўскага" Крамля быў прапанаваны старшынём ПАРЕ ў інтэрв'ю радыё "Эхо Москвы" ў траўні 2006 **[7].** У размове з журналістамі ён настойліва падкрэсліваў важную ролю Расіі ў вяртанні Беларусі на дэмакратычны шлях развіцця. Выкарыстоўваючы свае асаблівыя адносіны з Беларуссю, Масква, на думку палітыка, магла б выступіць пасярэднікам і пераканаць Лукашэнку змяніць сваё стаўленне да каштоўнасцей еўрапейскай сям'і.

Паўстае справядлівае пытанне, якім чынам Крэмль, што імкліва спаўзае да таталітарнага стылю кіравання з паслядоўным пагаршэннем сваіх стасункаў з Захадам, зможа дапамагчы Мінску лепш зразумець прынцыпы дэмакратыі і правоў чалавека? Тым не менш старшыня ПАРЕ выказаў спадзяванне, што ў часе старшынства Расіі ў Радзе Еўропы (19 траўня – 15 лістапада 2006) у Беларусі з'явіцца больш магчымасцей для ўдзелу ў працы арганізацыі, якая налічвае 47 краін-сяброў **[8].**

Прызначаны палітычным камітэтам ў лютым 2007 г. новы дакладчык па Беларусі Андрэа Рыгані (Італія, ALDE) наведаў Беларусь ў кастрычніку 2007 г. з азнаямляльным візітам дзеля напісання дакладу па сітуацыі ў краіне. Пазней ён таксама зрабіў заяву пра тое, што палітычны "дыялог з Беларуссю павінны быць узноўлены" **[9]**. "Радзе Еўропы неабходна сур'ёзна падумаць пра тое, што яна можа зрабіць, каб папулярызаваць дэмакратычныя каштоўнасці ў гэтай дзяржаве. Я супраць спынення ўсіх кантактаў з беларускімі ўладамі. Як мы бачым, гэта ніякім чынам не ўплывае на сітуацыю і ўскладняе нам магчымасць размовы з беларускім народам" **[10]** , – адзначыў дакладчык па Беларусі. Яго погляды і моцнае перакананасць у неабходнасці дыялогу, нягледзячы на пастаянную складаную сітуацыю з правамі чалавека ў краіне, сталі вядомымі ў ПАРЕ як *лінія Рыгані*.

Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы стаіць перад тым жа выбарам у дачыненні Беларусі – супрацоўніцтва альбо адсутнасці супрацоўніцтва з уладамі – як і іншыя арганізацыі. З аднаго боку – і такі погляд выказваюць многія прадстаўнікі дэмакратычных сіл Беларусі – дыялог неабходны, як унутраны: паміж уладамі, апазіцыяй і грамадзянскай супольнасцю, так і знешні: паміж урадам і міжнароднай супольнасцю. З іншага боку, пастаянны пераслед актывістаў апазіцыйных партый і грамадзянскай супольнасці, допыты ў КДБ, масавыя арышты ў часе і пасля мірных акцый пратэсту, як гэта адбылося падчас мітынгу прадпрымальнікаў у студзені, ставяць пад сумнеў жаданне беларускага боку стаць бліжэй да Еўропы.

Што вылучае ПАРЕ сярод іншых еўрапейскіх структур у дылеме дыялогу, дык гэта амаль завершаная, але паспяхова стрыманая падчас апошняй сесіі ў Страсбуры кампанія Крамля па прасоўванні свайго кандыдата на пасаду кіраўніка арганізацыі, што ў перспектыве магло б прывесці да ўсталяванне яшчэ адной лініі – *лініі Маргелава* ў дачыненні да Беларусі.

Спадар Маргелаў, прызначаны Адзінай Расіяй і Крамлём **[11]** , у выпадку абрання старшынём Асамблеі і ў пошуках прыхільнікаў прынцыпу расейскай "кіраванай дэмакратыі" ў Страсбуры, хутчэй за ўсё прапанаваў бы пашыраныя магчымасці для прадстаўнікоў беларускіх улад. Дыялог з выкананнем неабходных умоў і пакрокавы падыход мелі шанец ператварыцца ў адзін крок без умоваў. У такім разе афіцыйны Мінск мог бы наблізіцца да еўрапейскіх структур з меншымі намаганнямі і без асаблівых паляпшэнняў у розных сферах, што сёння ад яго патрабуюцца.

Аднак, абранне іспанскага парламентарыя Луіса Марыі дэ Пуч замест Міхаіла Маргелава на змену Ван дэр Ліндэну, нягледзячы на вельмі настойлівыя спробы апошняга пралабіраваць расійскага палітыка, дае надзею на крышталізацыю адзінай еўрапейскай пазіцыі ў дачыненні да Беларусі.

Такім чынам, *лініі Маргелава* ў бліжэйшым часе не будзе. Адной складанасцю менш і ў без гэтага складаным пытанні ўзаемін паміж Беларуссю і астатняй Еўропай.

Погляды абодвух дакладчыкаў, Хрыстаса Пургурыдэса і Андрэа Рыгані заслугоўваюць увагі. Тупіковая сітуацыя з рэпрэзентацыяй Беларусі на міжнароднай арэне павінна знайсці вырашэнне. Дыялог з афіцыйнымі ўладамі і больш інтэнсіўнае супрацоўніцтва патрэбны, аднак лёс зніклых грамадскіх дзеячаў дагэтуль не вядомы, а штодзённы пераслед актывістаў, асабліва моладзевых, працягваецца. Дыялог дзеля дыялогу не можа папраўіць сітуацыю і не варты намаганняў без дакладнага плану і без выканання рэальных , а не тэхнічных умоў, адной з якіх, да прыкладу, з'яўляецца прыпыненне дзеяння ў Беларусі смяротнага пакарання. Вызваленне ўсіх палітычных вязняў павінна разглядацца як самы мінімум для пачатку якіх то ні было б сур'ёзных перамоў з цяперашнім беларускім кіраўніцтвам.

Заўчаснае вызваленне трох палітзняволеных у гэтым месяцы сталася добрым знакам з боку афіцыйных улад і хочацца спадзявацца, што гэта станецца пачаткам для далейшай лібералізацыі агульнапалітычнай сітуацыі. Аднак найбольш верагодным сцэнаром на бліжэйшую будучыню падаецца сумесь розных крокаў: ад хістання ў бок большай свабоды, да чарговых "вытанчаных" і яшчэ больш брутальных рэпрэсіўных дзеянняў.

Дэманстрацыі прадпрымальнікаў і мірнае святкаванне Дня волі 25 сакавіка, хутчэй за ўсё, закончацца так, як звычайна. Амаль не існуе верагоднасці таго, што прызначаныя на канец верасня парламенцкія выбары пройдуць ў адпаведнасці са стандартамі АБСЕ. Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы, якая з'яўляецца міжпарламенцкай арганізацыяй, тым не менш павінна ўважліва сачыць за развіццём гэтых падзей.

Міжнародная супольнасць павінна быць падрыхтавана да такіх крокаў Мінску і, адпаведна, праводзіць добра скаардынаваную палітычную лінію і ажыццяўляць пакрокавы дыялог, заснаваны на выкананні беларускімі ўладамі абавязковых умоў. Каардынацыя высілкаў паміж Еўразвязам і Радай Еўропы, а таксама іншымі еўрапейскімі інстытуцыямі абсалютна неабходна дзеля таго, каб пазбегнуць расколу ў палітыцы дачынна Беларусі, такога пажаданага як афіцыйным Мінскам, так і яго паплечнікамі ў Крамлі.

1 http://assembly.coe.int/ASP/NewsManager/EMB_NewsManagerView.asp?ID=50

2 http://assembly.coe.int/Main.asp?link=/Documents/AdoptedText/TA04/ERES1371.htm

3 http://assembly.coe.int/main.asp?Link=/documents/adoptedtext/ta04/eres1372.htm

4 http://assembly.coe.int/ASP/Press/StopPressView.asp?ID=1737

5 http://assembly.coe.int/ASP/NewsManager/EMB_NewsManagerView.asp?ID=2186

6 RFRL, January 17, 2007

7 http://naviny.by/rubrics/politic/2006/05/28/ic_news_112_230647/

8 Ibid.

9 http://assembly.coe.int/ASP/NewsManager/EMB_NewsManagerView.asp?ID=3497

10 Ibid.

11 Vladimir Socor, Two setbacks of the Kremlin at the Council of Europe, January 23, 2008

# У Еўрапарламенце збіраюць подпісы за паніжэнне кошту шэнгенцкіх віз для беларусаў



Тры дэпутаты Еўрапарламенту – ад Літвы, Польшчы і Аўстрыі пачалі збор подпісаў пад петыцыяй за паніжэнне кошту шэнгенцкіх віз для беларускіх грамадзян.

Як паведаміў адзін з ініцыятараў кампаніі літоўскі дэпутат Юстас Палецкіс, збор подпісаў пачалі 30 студзеня. “Гэта даволі працяглая працэдура, для якой у Парламенце існуе рэгламент чатыры-пяць месяцаў”, – адзначыў ён.

Дзеля станоўчага вырашэння пытання неабходна сабраць 392 подпісы, што складае больш за палову ад 785 сяброў заканатворчага органу.

Сп. Палецкіс зазначыў, што лічыць несправядлівымі высокія кошты на візы для беларусаў. “Мы кажам пра тое, што пашырэнне зоны Шэнгена канчаткова разбурыла “жалезную заслону”, але ў той жа час ствараем фінансава-бюракратычныя перашкоды на ўсходняй мяжы Еўразвязу”, — пракаментаваў ён.

Сябра Еўрапарламента не стаў прагназаваць колькі дэпутатаў пагодзяцца падпісаць петыцыю. На яго думку, шмат што залежыць і ад прадстаўнікоў Беларусі, прычым як грамадзянскай супольнасці краіны і іх магчымасці мабілізавацца і пераканаць дэпутатаў, што такое рашэнне неабходна, так і афіцыйных улад, якія мусяць прадэманстраваць канструктыўны падыход, пачаўшы выконваць хоць некаторыя з 12 умоў Еўразвязу.

Калі будзе сабраная дастатковая колькасць подпісаў, Прэздэнт Еўрапарламента зможа накіраваць петыцыю на разгляд у Еўракамісію і Раду Еўразвязу. “Там гэта рашэнне будуць абмяркоўваць. Аднак рашэнне па зніжэнні візавых коштаў у Звязе мусіць прымацца адзінагалосна, усе 27 краін-сяброў павінны падтрымаць гэту ініцыятыву”, — адзначыў парламентарый.

01.02.2008

**Паводле БелаПАН**

## *Конкурс па прыёме студэнтаў у Каледжы міжнароднай супольнасці*

Беларускі камітэт Каледжаў міжнароднай супольнасці праводзіць чарговы конкурс па прыёме студэнтаў у Міжнародны Адрыятычны каледж у Італіі і ў Паўночны міжнародны каледж Чырвонага крыжа ў Нарвегіі. Пачатак навучання – 2008/09 н. г.

Навучанне ў Каледжах міжнароднай супольнасці (United World Colleges, UWC) вядзецца на ангельскай мове па сістэме Міжнароднага бакалаўрэата (International Bacalaureat, IB). Тэрмін навучання – 2 гады. Па заканчэнні каледжу выпускнікам выдаецца дыплом, які дае магчымасць працягнуць навучанне ва універсітэтах большасці краін свету.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы, якія будуць мець узрост 16 - 17 год на 1 верасня 2008 г. Конкурс праводзіцца ў 2 туры. На I-ы тур удзельнікам конкурсу неабходна даслаць на электронны адрас uwcblr@gmail.com дакументы і конкурснае эсэ **да 2 сакавіка 2008 г.**

Больш поўную інфармацыю і прыклад эсэ за мінулы год можна атрымаць вось тут

http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki/